CORE Metadata, citation and similar papers at core.ac.uk

УДК 947.6(476)

# УМОВЫ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ НА НЕАКУПІРАВАНЫХ БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ ПАДЧАС ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (ЖНІВЕНЬ 1915 – ЛЮТЫ 1917 ГГ.)

***М.В. ЦУБА***
*Палескі дзяржаўны універсітэт,*
*г. Пінск, Рэспубліка Беларусь*

## УВОДЗІНЫ

Восенню 1915 года Беларусь у выніку ваенных няўдач і адступлення расійскай арміі была падзелена на дзве часткі: заходнюю (Гродзенская, большая частка Віленскай і частка Мінскай губерняў), акупіраваную германскімі войскамі; і ўсходнюю неакупіраваную (Віцебская, Магілёўская і частка Мінскай губерняў).

Паражэнні расійскай арміі ў ходзе баявых дзеянняў, неарганізаванасць і непадрыхтаванасць да вайны выяўлялі правал не толькі ваеннай палітыкі самадзяржаўя, але разам з тым моцна ўздзейнічалі на грамадска-палітычную думку ў бліжайшым тыле, дзе добра было вядома аб сапраўдным становішчы на фронце.

Гэтыя акалічнасці садзейнічалі таму, што на неакупіраванай частцы Беларусі, дзе знаходзіліся расійскія войскі «адбываліся многалікавыя мабілізацыі, арышты і ссылкі ў 1915-1916гг., і панаваў ашалелы рэжым кіравання прыфрантавой паласы» [1, с.215]. Тут нават пад пагрозай прыцягнення да адказнасці забаранялася ўсялякая перапіска, якая хаця б ускосна датычылася якіх-небудзь ваенных ці супрацьурадавых звестак [2, арк.146].

## ВЫНІКІ І ІХ АБМЕРКАВАННЕ

Безумоўна, у такіх абставінах ніякіх арганізацый, якія насілі б нацыянальны характар і мелі б пэўную форму, не было. Існавалі невялікія разрозненыя групы, пераважна на фронце і ў буйных беларускіх гарадах, якія будучы неаб'яднанымі для сістэматычнай працы з масамі, самі шукалі выйсця са склаўшагася становішча. Адным з такіх выйсцяў для многіх беларусаў-католікаў, якія добра ўсведамлялі, што ўсе роўна яны будуць мабілізаваныя ў расійскую армію і звязвалі ідэі незалежнасці Беларусі з польскім нацыянальным рухам, была іх просьба ісці служыць у польскія вайсковыя часці пры расійскай арміі. Гэтыя часці пачалі ствараецца яшчэ на пачатку 1915г. Большасць гэтых людзей спадзявалася, што, служачы ў польскіх вайсковых фарміраваннях, яны прынясуць больш карысці сваёй Бацькаўшчыне, а пры неабходнасці змогуць накіраваць зброю і супраць царскага ўраду, да чаго ў гэты час настойліва заклікала РСДРП і шматлікія «нелегальныя арганізацыі пілсудчыкаў у Каралеўстве Польскім у распаўсюджваемых лістоўках» [3, с.163]. Вядома, што асноўны клопат па фарміраванні такіх вайсковых часцей, а затым і ў стварэнні брыгады, узялі на сябе князі Любамірскія, У. Святаполк-Мірскі, З. Козел-Паклеўскі, князь Радзівіл і іншыя памешчыкі беларускага паходжання, якія мелі значны ўплыў на беларускі нацыянальны рух. Да таго ж для папаўнення гэтай брыгады былі накіраваны салдаты-католікі «з запасных палкоў Паўночнага і Заходняга франтоў, Смаленскага і Гомельскага размеркавальных пунктаў і навабранцы з Беларусі...» [3, с.165].

У сакавіку 1916г. перад выступленнем брыгады на пазіцыі пад Баранавічы яна налічвала 4 тысячы салдат. Але колькасны склад не адпавядаў якаснаму. Салдаты не хацелі ваяваць за чужыя інтарэсы. У выніку пашырыліся антываенныя настроі і пачалося дызерцірства, якое не маглі спыніць нават смяротныя казні. Асабліва масавы характар яно набыло ў час знаходжання брыгады на Заходнім фронце, які цалкам размяшчаўся на тэрыторыі Беларусі, і ўцекачам было не цяжка дабрацца да родных мясцін. Зразумеўшы, што ніякія меры не прынясуць належнага выніку, камандванне Заходняга фронту перакінула яе на Каўказскі фронт [3, с.169].

У другой палове 1916 г. прыкладна ў такім становішчы аказаліся і іншыя вайсковыя часці Заходняга фронту. Салдацкія масы пастаянна адчувалі на сабе ўплыў рэвалюцыйных падзей у тыле і ў сваю чаргу аказвалі ўздзеянне на палітычныя сілы ў краіне, паміж якімі ў той жа час рэзка абвастрылася палітычная барацьба. Аб гэтым сведчыць данясенне начальніка штаба Мінскіх



Полесгу

ваенна-акружных упраўленняў да мінскага губернатара, дзе гаворыцца, што «па назіранню за ніжнімі чынамі, прыбываючымі ў армію маршавымі ротамі, пацыфісцкія і іншыя ідэі не перастаюць пранікаць у асяроддзе ніжніх чыноў, з прычыны чаго ў некаторых выпадках праяўлялася недастатковасць энергіі і нават імкненне здацца ў плен. Так як падобныя ідэі могуць пранікаць толькі збоку, то галоўнакамандуючы арміямі Заходняга фронту загадаў прыняць самыя рашучыя меры для таго, каб ніжнія чыны не маглі мець ніякіх сувязяў з пабочным элементам, сярод якога могуць быць прапагандысты гэтых ідэй» [4, с.876-877].

Вырашыць праблему спынення антываенных настрояў і зберагчы армію ад развалу царскі ўрад меркаваў з дапамогай жорсткіх рэпрэсій, масавых арыштаў, ваенна-палявых судоў і іншых мер. Напрыклад, у данясенні галоўнага начальніка мінскай ваеннай акругі ад 10 сакавіка 1915г. паведамляецца, што «ніжнія чыны І.Ш. Зігер і Б.Н. Расінскі, ураджэнцы Мінскай губерні, пры пераходзе іх палка на ўмацаваную пазіцыю, здаліся ў палон ворагу, не выкарыстаўшы ўсіх сродкаў да супраціўлення. Такое ганебнае парушэнне названымі чынамі свайго абавязку перад царом і Радзімай дае права спыніць клопат аб дастатку іх сем'яў» [5, арк.93].

Але нягледзячы ні на якія меры тысячы салдат працягвалі здавацца ў палон, а іншыя тысячы пакідалі акопы і збягалі з фронту. Толькі на пачатку 1916г. з трох армій Заходняга фронту, размешчанага на Беларусі, дэзерціравала 11 тысяч чалавек [6, с.624]. Нізавы рух салдацкіх мас дапаўняўся намаганнямі РСДРП і некаторых іншых рэвалюцыйна-дэмакратычных арганізацый, якія ўносілі сваю долю ў развал расійскага фронту і на дадзеным этапе – свядома ці не – садзейнічалі актывізацыі адраджэнскага нацыянальнага руху ва Усходняй Беларусі [7, с. 145].

З напісанай у канцы вайны дэкларацыі, у якой А. Цвікевіч і С. Рак-Міхайлоўскі імкнуліся прааналізаваць становішча адраджэнскай справы ва усходняй частцы Беларусі ў 1915 годзе, вынікае наступнае: «Пасля захопу Вільні нямецкім войскам, беларуская работа ва ўсходняй частцы краю на момант прыпынілася. Старых працоўнікаў лёс параскідваў па ўсёй Расіі, а тыя, што засталіся на сваёй зямлі, страціўшы сувязь з даўнейшым віленскім цэнтрам, з вялікай цяжкасцю знаходзілі сілы для арганізацыі новага цэнтра. Да таго ж край запаланілі мільёны наехаўшых сюды чужых людзей, якія захапілі ў свае рукі ўсё тутэйшае жыццё. Аднак, беларуская работа ў той ці іншай форме працягвала трываць далей» [8, с. 75].

Дзякуючы зменeным у гэты час абставінам, па сцвярджэнні Язэпа Варонкі, «нацыянальная праца кіпела ў раёнах вольных ад нямецкай акупацыі беларускай тэрыторыі, а дакладней, у такіх месцах, як Полацк, Віцебск, Смаленск, Магілёў, Бабруйск, Слуцк, якія былі звязаны, як са сваім цэнтрам, - усе з Менскам» [9, с.5]. Так паступова ўсё больш узрастае роля Мінска, які «становіцца цэнтрам нацыянальна-палітычнага руху і дзяржаўнага адраджэння Беларусі» [10, с.7].

А канец 1916-га - пачатак 1917г. азнаменаваліся адраджэннем беларускага нацыянальнага руху амаль ва ўсёй частцы Беларусі, якая ўваходзіла ў сферу дзейнасці расійскіх войск. У гэты час у вялікіх і малых гарадах і мястэчках на неакупіраванай частцы Беларусі пачынаюць дзейнічаць самыя розныя нацыянальныя па форме арганізацыі, у асноўным культурна-асветніцкія. Прыкладам у справе нацыянальнай дзейнасці ў гэты перыяд з'яўляецца Мінск, у якім маладая беларуская інтэлігенцыя аб'ядноўвалася ў таварыствы, клубы, гурткі, каб паспрабаваць заявіць аб сабе, сваіх намерах, здольнасцях, задумах і планах. Асноўнымі цэнтрамі такіх аб'яднанняў інтэлігенцыі і моладзі тады былі «беларускія хаткі» [11, с.10]. Як правіла, па суботах у іх адбываліся доўгія і змястоўныя вечарыны, на якіх абмяркоўваліся палітычныя пытанні, разбіраліся і асэнсоўваліся беларускія нацыянальныя справы, арганізоўваліся спектаклі і іншыя культурна-асветніцкія мерапрыемствы.

У Мінску адным з такіх пунктаў, які аб'ядноўваў беларускіх пісьменнікаў, паэтаў, мастакоў, публіцыстаў і іншых культурных дзеячаў, з'ўлялася «беларуская хатка», створаная па ініцыятыве Мінскага аддзела «Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны». Яна размяшчалася ў сталовай гэтага таварыства ў доме пад нумарам 18 па Захараўскай вуліцы каля Чырвонага касцела [12, с.133]. У яе рабоце таксама, як і ў працы таварыства, прымалі актыўны ўдзел буйны беларускі землеўласнік Раман Скірмунт, прадстаўніца старога беларускага роду княгіня Магдалена Радзівіл, ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі, тэатральныя дзеячы Уладзіслаў Галубок, Усевалад Фальскі, вучоны Аркадзь Смоліч, архітэктар Лявон Дубяйкоўскі, літаратары - Ядвігін Ш. (Антон Лявіцкі), Змітрок Бядуля, Арнольд Паўловіч, Язэп Фарботка, Рамуальд Зямкевіч, а таксама пазней вядомыя дзеячы беларускага нацыянальнага руху - Язэп Лесік, Фабіян Шантыр, Зоська Верас, Людвіка Сівіцкая, Ванда Лявіцкая і іншыя [13, с.149]. У шматлікіх культурна-асветніцкіх мерапрыемствах, якія рыхтавала і праводзіла «Беларуская хатка», былі адлюстраваны сацыяльна-вострыя і актуальныя праблемы грамадскага і палітычнага жыцця беларускага народа. У «Беларускай хатцы» былі



ПолесГУ

пастаўлены п’есы Я.Купалы, К.Каганца, інсцыніравана паэма «Тарас на Парнасе» і інш. [14, с.47]. Усё гэта садзейнічала распаўсюджванню прагрэсіўных настрояў сярод шырокіх слаёў насельніцтва, узмацняла працэс кансалідацыі рэвалюцыйна-дэмакратычных сіл у беларускім нацыянальна-вызваленчым руху.

Такім чынам, як у рабоце «хаткі», так і ў цэлым Мінскага аддзела «Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны» галоўную ролю адыгрывалі прадстаўнікі дэмакратычнай беларускай інтэлігенцыі. Менавіта пад іх уплывам дадзенае таварыства арганізоўвала і праводзіла асветніцкія і дабрачынныя мерапрыемствы, мерапрыемствы ў абарону беларускай культуры, збіраліся сродкі для аказання дапамогі параненым, бежанцам, салдацкім сем’ям.

Актыўны удзел у працы Мінскага аддзела таварыства прымаў Максім Багдановіч. У Мінскай губерні знаходзілася вялікая колькасць бежанцаў. Многія жылі пад адкрытым небам. Паэт, сам будучы смяротна хворым, не шкадаваў сіл, каб аблегчыць лёс гэтых людзей. Ён друкаваў артыкулы ў часопісе «Украинская жизнь», якія расказвалі аб цяжкасцях бежанцаў, дзейнасці таварыства, аб дзіцячым прытулку, што знаходзіўся ў Ратамцы пад Мінскам [12, с. 133-134]. На працягу некалькіх месяцаў М.Багдановіч рэгулярна прыходзіў у «Беларускую хатку», сустракаўся з яе наведвальнікамі. Ен нікога не вучыў, як жыць і што рабіць. Сама справа жыцця Багдановіча станавілася для інтэлігенцыі і маладых людзей Мінска ўзорам і прыкладам служэння Айчыне, вернасці абранаму шляху.

«Ніхто не чытаў нам лекцыяў, не пераконваў, не агітаваў, – напісана ў артыкуле Апалоніі Савенак «Калісьці ў Менску». – Гэтыя выдатныя людзі выбралі найвастрэйшую зброю - мастацкае слова. Яны прамаўлялі да нас вуснамі нашых паэтаў-адраджэнцаў. Калі Смоліч дэкламаваў Купалава «Над Нёманам» або Гарунова «Ты, мой брат, каго звацъ беларусам...», калі Галубок дэкламаваў гарачыя Купалавы поклічы, калі Лявіцкая дэкламавала цёплыя Цётчыны ды Буйлянчыны творы – тут была й любасць да пакрыўджанае Бацькаўшчыны, і слаўная мінуўшчына яе, і пашана да свае мовы. Гэта было для нас і навукай, і клічам, і загадам, і праграмай дзейнасці. Мы бачылі ідэю, тую высокую, велічную ідэю змагання за волю свае Бацькаўшчыны й свайго народу...» [11, с.12].

Сусветная вайна пашырыла фронт барацьбы нацыянальных сіл на Беларусі супраць самадзяржаўя. «Кінуты дэмакратыяй у час гэтай крывавай вайны лозунг самаадзначэння кожнага народу, больш як калі патрэбен цяпер для правядзення яго ў жыццё», – пісаў у тыя дні вядомы беларускі дзеяч Фабіян Шантыр [15, с.18]. Менавіта ў гэты час настойліва спрабавалі заявіць аб сваёй палітычнай ролі на Беларусі і некаторыя прадпрымальніцкія, гандлёва-прамысловыя колы беларусаў, у асноўным тыя, якія арыентаваліся на сельскую гаспадарку.

Найбольш актыўная праца ў гэтым накірунку была разгорнута Раманам Скірмунтам, які меў значную падтрымку і папулярнасць «сярод шырокіх колаў шляхты і ў часткі мясцовага насельніцтва» [16, арк. 16]. Усведамляючы адметнасць беларусаў ад расійцаў і палякаў ён выступаў у падтрымку шырокага стварэння школ з беларускай мовай навучання, за беларускасць, супраць падзелу беларускага народа па веравызнанню – на палякаў-каталікоў і расійцаў-праваслаўных. Па меркаваннях А. Ільіна, магчыма Р. Скірмунт быў захоплены «хлебаробчымі ідэямі» вядомага ўкраінскага гісторыка і філосафа Вячаслава Ліпінскага (1882 – 1931гг.), які ў барацьбе за стварэнне незалежнай Украінскай дзяржавы рабіў стаўку на заможнае сялянства і землеўладальнікаў [17, с. 98]. Менавіта гэтае саслоўе павінна было стаць той галоўнай і кіруючай сілай, якая здолела б павесці за сабой усе іншыя колы беларускага грамадства ў дзяржаваўтваральным накірунку.

З гэтай мэтай у канцы 1916 г. у Мінску пад кіраўніцтвам ініцыятыўнай групы палітычных дзеячаў, у якую ўваходзілі Р.Скірмунт, П.Алексюк, В.Чавусаў і некаторыя іншыя, была разгорнута праца па стварэнні партыі беларускіх народных сацыялістаў (ПБНС) [7, с. 150].

У праграмных дакументах партыі дамінавалі ліберальна-дэмакратычны і нацыянальны накірункі: прадастаўленне Беларусі тэрытарыяльна-гаспадарчай аўтаноміі, адраджэнне беларускай культуры, аддача часткі прыватнаўласніцкіх зямель на карысць сялян і іншыя [18, с.77]. Такім чынам, у ходзе паступовай дыферэнцыяцыі ў грамадстве адбылося выдзяленне ліберальна-дэмакратычнага накірунку ў беларускім нацыянальным руху. Аднак арганізацыйнае афармленне дадзенай партыі было канчаткова завершана толькі пасля Лютаўскай рэвалюцыі.

Цяжкія ўмовы вайны, якія перашкаджалі арганізацыйнаму афармленню, уплывалі як на беларускі нацыянальны рух, так і на сацыял-дэмакратычныя плыні ў цэлым. «Закінутыя ў наш край, у Мінск, у сілу ўмоў імперыялістычнай вайны, асобныя рэвалюцыянеры сацыял-дэмакраты (а таксама некаторыя мясцовыя дзеячы часткова разгромленага нацыянальнага руху) да пачатку



Полесгу

(Лютаўскай) рэвалюцыі толькі паспелі наладзіць кое-якія паміж сабой сувязі і адзначыць неабходнасць арганізацыі, але перайсці да працы па стварэнню самой арганізацыі яшчэ не паспелі», - пісаў у сваіх успамінах Вільгельм Кнорын [19, с.3].

Але заслугоўвае ўвагі ў гэты час даволі значная работа, якая разгортвалася на культурна-нацыянальнай ніве. Напрыклад, побач з «хаткай» па Захараўскай вуліцы знаходзілася і першая ў Мінску беларуская кнігарня. Яе заснавалі Антон Лявіцкі (Ядвігін Ш.) і Алесь Уласаў. Тут прадаваліся кнігі Якуба Коласа «Песні жальбы» і «Родныя з'явы», Янкі Купалы «Гусляр» і «Жалейка», Максіма Гарэцкага «Рунь», Францішка Багушэвіча «Дудка Беларуская», Максіма Багдановіча «Вянок», Цёткі «Скрыпка беларуская», Ядвігіна Ш. «Бярозка», часопіс «Маладая Беларусь, газета «Наша ніва» і іншыя [11, с.10].

Акрамя таго, прадпрымаліся настойлівыя спробы ажыццявіць выданне беларускага часопіса, але, на жаль, з гэтага нічога не атрымалася. Сведчанне таму – пасланне Мінскага губернатара да мясцовага паліцмейстэра ад 12 снежня 1916г. з наступным зместам: «Прапаноўваю Вам абвясціць Вільгельму Казіміравічу Русецкаму (вул. Старажавая, д.1), што хадатайніцтва аб дазволе выдаваць яму ў г. Мінску штотыднёвы часопіс на беларускай мове пад назвай «Беларусь», ваеннымі ўладамі пакінута без задавальнення» [20, арк.4].

Нягледзячы на вайну, беларускія грамадскія колы неаднаразова ўздымалі пытанне аб адкрыцці на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі ўніверсітэта. Думка аб неабходнасці адкрыцця вышэйшай навучальнай установы была настолькі важнай і адчувалася так востра, што у 1916 г., не звяртаючы увагі на ваенныя падзеі, амаль што адначасова губернскі земскі сход, Віцебская губернская земская ўправа, Мінская гарадская Дума і Мінскае губернскае земства хадайнічалі перад урадам аб адкрыцці ўніверсітэта ў адным з гарадоў Беларусі. Але Міністэрства Народнай Асветы на гэтыя хадайніцтвы адказала адмоўна. На думку Міністэрства, адкрыццё ўніверсітэта ў Мінску было немагчыма таму, што горад знаходзіуся блізка ад фронту, а такія гарады, як Віцебск і Магілёў не з'яўляліся згодна з урадавай тэрміналогіяй цэнтрамі Пауночна-Заходняга краю [21, с.13]. Без увагі засталіся і наступныя звароты з тлумачэннямі гарадской інтэлігенцыі да ўладаў Магілёва аб адкрыцці ўніверсітэта ў гэтым горадзе [22, арк.7]. Расійскі ўрад, вельмі добра разумеючы вялікае значэнне ўзнятай праблемы і неабходнасць яе станоўчага вырашэння, тым не менш адхіліў усе хадайніцтвы. На жаль, палітычныя меркаванні і на гэты раз узялі верх над рэальнымі патрэбамі нашага краю.

Вялікая грамадска-культурная праца праводзілася ў гэты час передавой беларускай інтэлігенцыяй па вывучэнні і захаванні помнікаў гісторыі і культуры. Так, у сакавіку 1916г. у Мінску пры Цэнтральным грамадскім камітэце быў створаны Аддзел апекі над помнікамі мастацтва і культуры. Ініцыятарам яго стварэння была група энтузіястаў на чале з мастаком К.Біске, занепакоеных лёсам помнікаў гісторыі і культуры, якім у выніку вайны пагражала поўнае знішчэнне. Члены Мінскага аддзела складалі апісанні помнікаў, фатаграфавалі іх, удзельнічалі ў навуковых экспедыцыях. З асаблівай увагай адносіліся да тых аб'ектаў, якія знаходзіліся ў зоне непасрэдных баявых дзеянняў. У Мінску былі арганізаваны сховішчы, куды звозіліся калекцыі твораў мастацтва, бібліятэкі, архівы. За кароткі час было сабрана каля 36000 адзінак захоўвання. Тут знаходзілася больш за 4000 фотаздымкаў і малюнкаў помнікаў архітэктуры Беларусі і прыкладна такая ж колькасць картак з інфармацыяй аб недаследаваных аб'ектах, каля 100 планаў гарадоў і асобных збудаванняў, складзена іх апісанне. Аддзел апекі над помнікамі зафіксаваў шмат пабудоў, якія за час вайны былі знішчаны. У Мінску па ініцыятыве Аддзела ў лістападзе 1916г. праводзіліся выстаўкі, збор грошай з якіх пералічваўся ў фонд аховы помнікаў [23, с.19].

Разам з краязнаўствам працягваліся ў гэты час і этнаграфічныя даследаванні. Цікавасць да іх у першую чаргу была абумоўлена ажыўленнем нацыянальна-адраджэнскага руху на Беларусі. Менавіта гэтай акалічнасцю можна растлумачыць з'яўленне серыі этнаграфічных картаў рассялення усходнеславянскіх народаў (працы Т. Фларынскага, П. Пешціча, А. Рыціха) і даследаванні аб паходжанні беларускай народнасці і яе мовы (працы Я. Карскага). Вайна перапыніла навуковую работу ў гэтай галіне, але вядома, што Е.Раманаў, А.Багдановіч і Я.Карскі ў эвакуацыі працягвалі апрацоўку раней сабраных матэрыялаў. Так, у маскоўскім выдавецтве ў 1916г. выйшла першая кніга 3-га тома вядомай працы Я. Карскага «Беларусы» [24, с.92].

У гады вайны працягвала развівацца і беларуская навукова-педагагічная справа. Яна змяшчала рознабаковыя ідэі, прапановы, рэкамендацыі, абагульненні педагагічнага вопыту вучэбных установ з беларускіх губерняў. Змястоўнай крыніцай педагагічнага вопыту, здабытага настаўніцтвам Беларусі на пачатку XX ст., была кніга А. Шэстава «Навуковая педагогіка і руская школа», выдадзеная ў Юр'еве ў 1916 годзе. Прааналізаваўшы і абагульніўшы недахопы вучэбна-

выхаваўчага працэсу ў сярэдніх навучальных установах Віленскай вучэбнай акругі, аўтар прыйшоў да высновы, што гэтыя ўстановы не змаглі стаць «самастойнай школай для жыцця», а з'яўляліся толькі «дрэннымі падрыхтоўчымі класамі для вышэйшай школы». У мэтах выйсця вучэбных устаноў з крызіснага стану А. Шэстаў прапанаваў выпрацаваць сістэму выхавання і навучання на нацыянальнай аснове, галоўную ўвагу надаваць педагагічнай навуцы і асабліва павышэнню яе ўзроуню ў педагагічным асяроддзі, ажыццявіць збліжэнне школы з сям'ёй і ўдзел усіх здаровых сіл грамадства ў арганізацыі школьнай сістэмы [25, с.78].

## ВЫВАДЫ

Падчас вайны ў перыяд жорсткіх рэпрэсій умовы для вядзення якой-небудзь нават культурна-нацыянальнай работы на неакупіраванай частцы Беларусі, што знаходзілася ў прыфрантавой паласе, былі надзвычай цяжкія. Ваенна-паліцэйскі рэжым, парушэнне сувязяў паміж усходнімі і заходнімі беларускімі губернямі, мабілізацыя на вайсковую службу вядомых беларускіх нацыянальных дзеячаў (Я.Купала, Я.Колас, К.Езавітаў, Я.Варонка, І.Серада, А.Чарвякоў, Я.Мамонька, А.Баліцкі, В.Захарка, М.Дзямідаў, Я.Кастыцэвіч, С.Рак-Міхайлоўскі і інш.) прывялі да часовага спынення амаль усялякай працы на нацыянальнай глебе.

Аднак паступова грамадскае жыццё, якое абмяжоўвалася ўмовамі ваеннага часу, набыло некаторыя новыя рысы. Голад, холад, бяспраўе, паражэнні ў працяглай вайне выклікалі стыхійныя незадавальненні салдат. Дадзеныя абставіны спрыялі для разгортвання рэвалюцыйнай прапаганды, што ў сваю чаргу садзейнічала ўздыму і актывізацыі адраджэнскага руху ва ўсходняй частцы Беларусі. Тут пачынаюць дзейнічаць самыя розныя нацыянальныя па форме аб'яднанні беларускай інтэлігенцыі і моладзі, цэнтрам збору якіх тады з'яўляліся «беларускія хаткі».

У канцы 1916 года ў беларускім грамадстве адбылося выдзяленне ліберальна-дэмакратычнай плыні ў беларускім нацыянальным руху: пачалася праца па стварэнні партыі беларускіх народных сацыялістаў (ПБНС), што спрыяла кансалідацыі нацыянальных сіл незалежна ад іх класавага паходжання.

У гэты час мела месца і некаторая культурна-асветніцкая праца, дзе былі дасягнуты пэўныя поспехі ў галіне этнаграфіі, краязнаўства, педагогікі, у справе прапаганды беларускіх кніг і г.д.

## ЛІТАРАТУРА


1. Беларусь: нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху. – Мінск: ЦВК БССР, 1924. – 323 с.
2. НАРБ. – Ф.705.- Воп.1. – С. 27.
3. Первая мировая война 1914 – 1918. (Белякевич И.И. Из истории создания польских национальных формирований в составе русской армии во время первой мировой войны). – М.: Наука, 1968. – 375 с.
4. Документы и материалы по истории Белоруссии (1900-1917 гг.). – Минск: Изд-во АН БССР, 1953. – Т.3. – 1019 с.
5. НАРБ. – Ф. 295. – Воп.1. – С. 8942.
6. Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972. Т.2. Беларусь у перыяд капіталізму (1861-1917гг.). – 688 с.
7. Цуба, М.В. Беларускі нацыянальны рух у перыяд паміж дзвюма дэмакратыч нымі рэвалюцыямі (1907 – люты 1917гг.). Матэрыялы да курса «Гісторыя Беларусі»/ М.В. Цуба. – Брэст, выдавецтва С. Лаўрова, 2003. – 196 с.
8. Весялкоўскі, Ю. Беларусь у Перщай сусветнай вайне (Гістарычны нарыс)./ Ю. Весялкоўскі. – Беласток-Лёндан, 1996. – 361 с.
9. Воронко, Я. Беларускі рух ад 1917 да 1920 году. Кароткі агляд./ Я. Воронко. – Коўна: Др. А.Бака і Х.Манкес, 1920. – 32 с.
10. Цвикевич, А. Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики./ А. Цвикевич. – Киев: Тип. И.И.Чоколов, 1918. – 16 с.
11. Мяснікоў, А. Нацдэмы: Лёс і трагедыя Фабіяна Шантыра, Усевалада Ігнатоўскага і Язэпа Лёсіка /Прадмова Б.Сачанкі. – Мінск: Беларусь, 1993. – 110 с.
12. Памятники Минска / Авт.-сост. В.П.Шамов. – Минск: Полымя, 1991 – 208 с.
13. Скалабан, В. В это суровое и важное время: Максим Богданович в Минске/ В.В. Скалабан // Нёман. – 1981, – N12. - С. 148-152.
14. Сташкевич, Н.С. Приговор революции: Крушение антисоветского движения в Белоруссии (1917-1925)./ Н.С. Сташкевич. – Минск: Университетское, 1985. – 304 с.
15. Шантыр, Ф. Патрэбнасць нацыянальнага жыцця для беларусаў і самаадзначэння народу. / Ф. Шантыр. – Слуцк: Др.З.Барнака, 1918. – 21 с.
16. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. – Ф. 2001. Воп. 4. – С. 1992.
17. Вяртання маўклівая споведзь: Постаці творцаў беларускай гісторыі ў кантэксце часу. – Мінск: Выш. шк., 1994, 318 с.
18. Октябрь 1917 и судьбы политической оппозиции. Совместное российско-белорусское исследование. В 3ч. Ч.2: У истоков политического противостояния. Материалы и документы по истории общественных движений и политических

партий Республики Беларусь / Н.С.Сташкевич, Г.Г.Касаров, Р.В.Платонов и др.; Под ред. Э.М.Энтина. – Гомель: Белорусское Агенство научно-технической и деловой информации, 1993. – 228с.
19. Кнорин, В. Революция и контрреволюция в Белоруссии ч.1. / В.Кнорин. – Смоленск, 1920. – 62 с.
20. НАРБ. – Ф.295. – Воп.1. – С. 9242.
21. Пічэта, І.І. Пытанне аб вышэйшай школе на Беларусі ў мінулым. / І.І. Пічэта. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 48 с.
22. НАРБ. – Ф.2084. – Воп.1. – С. 257.
23. Дзянісаў, У. З гісторыі аховы помнікаў / У. Дзянісаў. // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1984, № 3. – С. 19-20.
24. Беларуская мова: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; Пад. рэд. Міхневіча А.Я.; Рэдкал.: Сачанка Б.І. (гал. рэд.) і інш. – Мінск: Бел. Эн., 1994. – 655 с.
25. Снапкоўская, С.В. Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі: З гісторыі школы і педагагічнай думкі Беларусі канца XIX – пачатку XX ст. / С.В. Снапкоўская. – Мінск: Нар. асвета, 1995. – 128 с.

# THE CONDITIONS OF SOCIAL POLITICAL TRENDS ON THE UNOCCUPIED BELARUSIAN TERRITORIES DURING THE WORLD WAR I (AUGUST, 1915 – FEBRUARY, 1917)

***M.V. TSUBA***

***Summary***

Peculiarities and activity trends of Social political life on unoccupied belarusian territories during World War I are investigated. Much attention is paid to the condition and circumstances which took place on the belarusian territories and exerted much influence on the activities of national organizations.

*Поступила в редакцию 28 мая 2009г.*

ПолесГУ